Прэзентацыя кнігі «Сыны Башкартастана ў баях за Беларусь», прымеркаваная да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 80-годдзя Вялікай Перамогі, прайшла ўчора ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі. У выданні, падрыхтаваным выдавецтвам «Беларусь» сумесна з архіўнымі і музейнымі ўстановамі нашай краіны і Башкартастана, прадстаўлены персанальныя даныя аб ураджэнцах Башкартастана, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну і пахаваны ў Беларусі. Кніга дапоўнена ілюстрацыйным матэрыялам.